

1



2

*Да арт.* ***Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў****: 1 — капэла беларускіх народных духавых інструментаў «Гуды»; 2 — ансамбль акардэаністаў «Туці».*

**БЕЛАРУ́СКІ ДЗЯРЖА́ЎНЫ УНІВЕРСІТЭ́Т КУЛЬТУ́РЫ І МАСТА́ЦТВАЎ** Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. Засн. ў 1975 як Мінскі ін-т культуры на базе аддзяленняў Мінскага пед. ін-та і Бел. тэатр.-маст. ін-та. З вер. 1993 Бел. ун-т культуры, з 2001 — Бел. дзярж. ун-т культуры, з 2004 сучасная назва. Ун-т з'яўляецца вядучай ВНУ у нац. сістэме адукацыі ў сферы культуры і мастацтва. У снеж. 2007 ун-т рэарганізаваны шляхам далучэння да яго ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны інстытут праблем культуры», на базе апошняга і ф-та павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў ун-та створаны Ін-т павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў (ІПКПК) як структурнае падраздзяленне ун-та. У 2009/10 навуч. годзе 5 ф-таў: культуралогіі і сацыякульт. дзейнасці, традыц. бел. культуры і сучаснага мастацтва, муз. мастацтва, інфармацыйна-дакументных камунікацый, завочнага навучання (філіял у г. Мазыр); 26 кафедр; н.-д. лабараторыі «Традыцыйныя рамёствы беларусаў», «Беларускія народныя музычныя інструменты», «Беларускі народны сцэнічны касцюм», сац.-пед. і псіхал. служба, навук.-творчае аб'яднанне «Studia Humanitatis», літ.-паэт. аб'яднанне «БУКет», студэнцка-пед. аб'яднанне «Настаўнік»; прадзюсерскі цэнтр «Арт-мажор». Аспірантура (з 1989). Працуюць 4 саветы па абароне кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый. З 1997 ва ун-це праводзяцца штогадовыя міжнар. навук. Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні, прысвечаныя дням слав. пісьменства і культуры. У складзе ун-та маст. галерэя «Універсітэт культуры» ў Палацы Рэспублікі. Дзейнічаюць фалькл.-этнаграф. калектывы «Валачобнікі», «Грамніцы», «Баламуты»; хары — нар. «Талака», акадэмічны «Мара», мужчынскі «Віват», камерны «Дабравест»; ансамблі акардэаністаў «Туці», вак. «Universum»; маладзёжныя аркестры — канцэртны духавых і ўдарных інструментаў «Светач», эстр.-сімф.; капэла бел. нар. духавых інструментаў «Гуды»; майстэрня эстр. танца, ансамбль кафедры харэаграфіі; тэатр гульні «Белая Русь», тэатр-студыя «7-ы паверх»; струнны квартэт «Arco», вак.-інструм. ансамбль «Блі-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ



*Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў.*

кі», майстэрня нар. дэкар.-прыкладнога мастацтва. З кастр. 2002 выдае навук.-метадычны час. «Веснік Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў». З сак. 2005 выходзіць студэнцкая газ. «Alma Parera», працуе студэнцкае радыё.

Будынак узведзены ў 1975 (архіт. Л.Маскалевіч, Ю.Грыгор'еў, А.Беразоўскі, Г.Ласкавая, В.Капылоў). Прамавугольны ў плане гал. аб'ём будынка адлюстроўвае функцыянальны прынцып архітэктуры неарацыяналізму. Фасады разбіваюцца раўнамернай сеткай вокнаў, якія знаходзяцца ў паглыбленнях бетонных блокаў. Такія ж квадратныя блокі запаўняюць тарцовыя часткі будынка. Два прыбудаваныя высокія прамавугольныя ў плане аб'ёмы, якія атрымалі службова-тэхн. прызначэнне, маюць рабрыстыя абрысы сцяны, што надае стройнасць і ўраўнаважанасць кампазіцыі. Ячэістая структура фасадаў, утвораная блочнай бетоннай канструкцыяй, ілюзорна стварае мазаічны дэкар. эфект.

*Л.І.Доўнар, Ю.Ю.Захарына* (архітэктура).

1 2



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ